**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Жыгалко**
**Аксана Алегаўна**

# МЕТАДАЛОГІЯ ЛЕКСІКАГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БССР (ПЕРШАЯ ПАЛОВА XX СТ.)

**Дыпломнае даследаванне**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Навуковы кіраўнік –**
**загадчык кафедры**
**беларускага мовазнаўства,**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт Дзятко Дз.В.**

**Мінск, 2013**

# РЭЗЮМЭ

Жыгалко Аксана Алегаўна

Метадалогія лексікаграфічнай дзейнасці ў БССР (першая палова ХХ ст.)

**Аб'ект даследавання** – лексікаграфічныя выданні першай паловы ХХ ст., а таксама разнастайныя праграмы і інструкцыі па збіранні лексікаграфічнага матэрыялу, распрацаваныя ў асноўным спецыялістамі Інстытута беларускай культуры.

**Мэта работы –** выявіць і ахарактарызаваць агульныя заканамернасці станаўлення лексікаграфічных метадаў і прыёмаў апрацоўкі лексічнага матэрыялу ў першай палове ХХ ст.

**Метады даследавання**: апісальны метад сінхроннага аналізу з элементамі дыяхраніі, параўнальна-супастаўляльны метад і асобныя прыёмы кампанентнага аналізу.

**Навуковая значнасць атрыманых ведаў** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве праведзена вывучэнне сродкаў і спосабаў лексікаграфічнай сістэматызацыі лексікі беларускай мовы першай паловы ХХ ст.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вывадыдыпломнага даследаваннямогуць быць выкарыстаны пры вывучэнні тэорыі лексікаграфіі, гісторыі развіцця нацыянальнай лексікаграфіі, стварэнні ўніверсальнай комплекснай тыпалогіі лексікаграфічных выданняў, пры далейшым удасканальванні мікраструктуры слоўнікаў розных тыпаў.

Матэрыялы дыпломнай працы атрымаюць прымяненне ў выкладанні курсаў сучаснай беларускай мовы, тэорыі і практыкі лексікаграфіі, гісторыі мовазнаўства, пры напісанні вучэбных дапаможнікаў, пры ўкладанні слоўнікаў, а таксама пры далейшым унармаванні беларускай лексікі ў плане кадыфікацыі іў плане функцыянавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ